# Да 500-годдзя беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання

**К. Д. Варанько,** вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

У культурнай спадчыне кожнага народа кніга заўсёды займала адметнае месца. Ва ўсе часы яна была і застаецца крыніцай ведаў, сродкам асветы, выхавання, пазнання навакольнага свету, сувяззю паміж мінулым і сучасным. Галоўным дасягненнем эпохі Адраджэння стала з'яўленне друкаванай кнігі, якая паўплывала на нацыянальную свядомасць народаў, адкрыла новую старонку ў развіцці адукацыі, літаратурнай мовы, мастацтва, далучыла людзей да скарбаў сусветнай цывілізацыі і культуры.

Беларускае кнігадрукаванне звязана з дзейнасцю выдатнага асветніка-гуманіста, пісьменніка Францыска Скарыны, які 6 жніўня 1517 г. выдаў у Празе на царкоўнаславянскай мове ў беларускай рэдакцыі Псалтыр — сваю першую кнігу. У 2017 г. у Беларусі і многіх краінах свету адзначаецца знамянальная дата — 500-годдзе беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання (уключана ў каляндар міжнародных памятных дат ЮНЕСКА). Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання распрацаваў комплексную праграму розных юбілейных мерапрыемстваў. Гэта — міжнародныя выстаўкі, круглыя сталы, навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі, сімпозіумы, фестывалі, прэзентацыі і інш. Нацыянальная бібліятэка Беларусі рыхтуе Міжнародны кангрэс «500 гадоў беларускага кнігадрукавання», Міжнародны выставачны праект «Францыск Скарына і яго эпоха». У 2017 г. будзе завершаны Міжнародны навуковы і выдавецкі праект «Кніжная спадчына Францыска Скарыны».

З выхаду першай беларускай кнігі прайшлі 5 стагоддзяў. Змяніліся форма і знешні выгляд выданняў, з'явіліся электронныя варыянты, і толькі сутнасць кнігі як носьбіта інфармацыі засталася нязменнай. Сёння кнігадрукаванне нашай краіны дасягнула значных поспехаў. Беларускую кнігу ведаюць у свеце. Традыцыйным стаў удзел айчынных выдаўцоў на міжнародных кніжных кірмашах, якія праходзяць у Маскве, Варшаве, Франкфурце. Узровень беларускага кнігавыдання дазволіў заснаваць Мінскі міжнародны штогадовы кніжны кірмаш. Сталіца Беларусі ўпэўнена імкнецца да набыцця статусу кніжнай сталіцы, і нашчадкі Францыска Скарыны плённай працай сцвярджаюць свае правы быць прадаўжальнікамі духоўнага подзвігу вялікага славянскага першадрукара.

У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (2017, № 4), які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, змешчаны бібліяграфічны спіс «З гісторыі беларускага кнігадрукавання (1517 г. — XVIII ст.)». Ён складаецца з наступных раздзелаў: «Узнікненне кнігадрукавання», «Францыск Скарына — слава і гонар Беларусі», «Брэсцкія друкарні», «Кнігадрукаванне ў Нясвіжы», «Друкарня ў Заблудаве», «Віленская друкарня Мамонічаў», «Віленская брацкая друкарня», «Куцеінская друкарня», «Магілёўская брацкая друкарня», «Супрасльская друкарня», «Віленская акадэмічная друкарня». Усе раздзелы спіса суправаджаюцца невялікімі нарысамі. Па прадстаўленай інфармацыі можна прасачыць этапы развіцця беларускага кнігадрукавання ад першага выдання Францыска Скарыны да канца XVIII ст.

Бібліяграфічны спіс адрасаваны бібліятэчным работнікам, настаўнікам, студэнтам, навучэнцам, а таксама ўсім, хто цікавіцца гісторыяй беларускай кнігі.